# XIV зьезд КП(б)Б

*Менск, Дом Культуры,*

## З уступнай прамовы т. Шаранговіча пры адкрыцьці зьезду

Таварышы! З часу 13-га да 14-га зьезду КП(б)Б прайшло каля 2-х год. За гэты пэрыод адбыліся зрухі сусьветна-гістарычнага значэньня як у краіне пролетарскай дыктатуры, так і ва ўсіх капіталістычных краінах сьвету. У нас, у краіне саветаў, вырашана ленінскае пытаньне „хто каго“ як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы на карысьць соцыялізму.

Шпаркія тэмпы індустрыялізацыі і разьвіцьця прамысловасьці ў першым годзе пяцігодкі стварылі магутную аснову для шпаркага разгортваньня будаўніцтва соцыялізму ў другой пяцігодцы.

... нага ажыцьцяўленьня генеральнай лініі партыі, непрымірымай барацьбы на два фронты: супроць правага опортунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць „левых“ загібаў і прымірэнцтва да іх. Гэтыя посьпехі партыя атрымала ў выніку рашучага разгрому троцкізму, які ператварыўся ў пераднявы атрад контррэволюцыйнай буржуазіі. Гэтыя посьпехі атрыманы ў жорсткіх баёх з клясавым ворагам, у выніку узмоцненага разгорнутага соцыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

Таварышы! XIV зьезд КП(б)Б будзе праводзіць свае работы ў той час, калі наша краіна ўступіла ў ... практыцы. Ліст тав. Сталіна абавязвае ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва ідэолёгічным фронтам.

На аснове непрымірымай барацьбы за ленінскую нацполітыку супроць усякіх адхіленьняў ад яе і ў першую чаргу супроць ухілу да велікадзяржаўнага шовінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць ухілу да беларускага і іншых шовінізмаў, КП(б)Б дасягнула надзвычай вялікіх посьпехаў у нацыянальна-культурным будаўніцтве.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК, разграміла беларускі контррэволюцыйны нацыянал-дэмократызм, бязьлітасна ўдарыла па вылазках вялі...

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы